**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Савецкая, 9,
220010, г. Мінск
тэл. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Советская, 9
220010, г. Минск
тел. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

02.11.2022 № 05-01-14/11197/дс/
На № ____________ от ____________

Структурныя падраздзяленні абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-уладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі

Аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу навуковых даследчых краязнаўчых работ навучэнцаў

У адпаведнасці з планам работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2022 год з мэтай развіцця навукова-даследчай дзейнасці як эфектыўнага фактара павышэння якасці адукацыі і ўсебаковага развіцця асобы навучэнцаў з кастрычніка 2022 года па красавік 2023 года праводзіцца рэспубліканскі конкурс навуковых даследчых краязнаўчых работ навучэнцаў (далей – конкурс).

Просім давесці інфармацыю аб правядзенні конкурсу і арганізаваць удзел зацікаўленых навучэнцаў установ адукацыі.

Умовы правядзення конкурсу размешчаны на сайце ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (http://rcek.by/).

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне 8017 3200633 (аддзел краязнаўства і патрыятычнага выхавання).

Дадатак: у 1 экз. на 5 л.

Намеснік Міністра А.У.Кадлубай

05-01 Драпакова 2226611

ДАДАТАК
да пісьма Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

__________ № _______________

**УМОВЫ**
**правядзення рэспубліканскага конкурсу**
**навуковых краязнаўчых работ навучэнцаў**

**1. Агульныя палажэнні**

1.1 Дадзеныя ўмовы вызначаюць парадак правядзення рэспубліканскага конкурсу навуковых даследчых краязнаўчых работ навучэнцаў (далей – конкурс).

1.2 Арганізатарам конкурсу з’яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Арганізацыйнае і метадычнае забеспячэнне правядзення конкурсу ажыццяўляецца ўстановай адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (далей – Рэспубліканскі цэнтр).

Для правядзення конкурсу на кожным этапе ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты).

Аргкамітэт кожнага этапу конкурсу:

забяспечвае арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне конкурсу;

даводзіць інфармацыю аб конкурсе да ведама ўстаноў адукацыі;

вызначае месца і канкрэтныя даты правядзення адпаведнага этапу конкурсу, які прадугледжвае вызначэнне пераможцаў і прызёраў;

ажыццяўляе персанальны падбор складу журы конкурсу і зацвярджае яго ва ўстаноўленым парадку;

аналізуе і абагульняе вынікі конкурсу;

асвятляе ход падрыхтоўкі, правядзення і вынікі конкурсу ў сродках масавай інфармацыі.

У склад аргкамітэтаў могуць уваходзіць прадстаўнікі зацікаўленых дзяржаўных органаў і арганізацый, грамадскіх аб’яднанняў, устаноў адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі органаў самаўпраўлення ўстаноў адукацыі і інш.

Для падвядзення вынікаў конкурсу на кожным этапе аргкамітэтам ствараецца журы, якое:

праводзіць папярэднюю экспертную ацэнку конкурсных работ, прадстаўленых навучэнцамі і іх абарону;

вызначае пераможцаў і прызёраў адпаведных этапаў конкурсу;

прадстаўляе пратаколы па выніках конкурсу ў адпаведныя

аргкамітэты.

**2. Мэта і задачы конкурсу**

Конкурс праводзіцца з мэтай развіцця навукова-даследчай дзейнасці як эфектыўнага фактару павышэння якасці адукацыі і ўсебаковага развіцця асобы навучэнца.

Задачы конкурсу:

стымуляванне матывацыі навучэнцаў да актыўнага ўключэння ў даследчую дзейнасць, прывіццё даследчых навыкаў;

выяўленне малавядомых альбо страчаных фактаў рэгіянальнай гісторыі, адметнасцяў матэрыяльнай і духоўнай культуры;

садзейнічанне фарміраванню ў маладога пакалення патрыятычных пачуццяў, адказнасці за адраджэнне і захаванне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны сваёй малой радзімы;

удасканаленне форм работы навуковых аб’яднанняў, аб’яднанняў па інтарэсах, факультатываў краязнаўчай накіраванасці;

садзейнічанне прафесійнаму самавызначэнню навучэнцаў.

**3. Удзельнікі конкурсу**

У конкурсе прымаюць удзел асобныя навучэнцы (індывідуальна) устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ва ўзросце 13 – 17 гадоў.

**4. Парадак правядзення конкурсу**

4.1 Конкурс праводзіцца ў чатыры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў на кожным этапе:

першы этап (адборачны) – ва ўстановах адукацыі;

другі этап (адборачны) – раённы, у тым ліку для гарадоў, якія маюць раённае дзяленне; гарадскі (акрамя г. Мінска);

трэці этап (адборачны) – абласны, Мінскі гарадскі;

чацвёрты (заключны) – рэспубліканскі.

Рэспубліканскі этап праводзіцца ў два туры: першы – завочны, другі – вочны.

4.2 Намінацыі конкурсу

На першы тур рэспубліканскага этапу конкурсу прадстаўляюцца самастойна выкананыя навучэнцам пад кіраўніцтвам педагога навукова-даследчыя праекты краязнаўчай накіраванасці ў наступных намінацыях:

гісторыя роднага краю (даследуюцца падзеі і факты гісторыі малой радзімы, помнікі археалогіі, даследаванні па тапаніміі і геральдыцы);

культурная спадчына (даследуюцца помнікі этнаграфіі і фальклору, аб’екты архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва);

геаграфічнае краязнаўства (даследуюцца прыродныя асаблівасці рэгіёна: геалогіі, геамарфалогіі, клімату, гідралогіі, расліннага і жывёльнага свету; эканоміка, прамысловасць, сельская гаспадарка і інш.).

Даследчая работа навучэнцаў павінна быць заснавана на мясцовым краязнаўчым матэрыяле, адлюстроўваць актуальнасць, навізну і навуковы падыход.

Для эфектыўнага вырашэння пастаўленных задач у якасці кансультантаў праектаў навучэнцаў могуць выступаць супрацоўнікі ўстаноў вышэйшай адукацыі, устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, навукова-даследчых інстытутаў, а таксама спецыялісты адпаведнай накіраванасці з іншых устаноў.

Другі тур рэспубліканскага этапу конкурсу пройдзе ў форме навукова-практычнай канферэнцыі, дзе навучэнцы будуць абараняць свае навуковыя праекты. Чарговасць выступлення ўдзельнікаў рэспубліканскай канферэнцыі вызначаецца членамі журы. Рэгламент выступлення – да 7 хвілін (даклад).

4.3 Патрабаванні да афармлення даследчых работ

Даследчая работа павінна прытрымлівацца наступнай структуры:

тытульны ліст (указваецца поўная назва ўстановы адукацыі (без скарачэнняў), раёна, вобласці, назва конкурсу/намінацыі/тэмы работы, прозвішча і імя аўтара работы, клас/аб’яднанне па інтарэсах, прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўніка работы, пасада, кантактны тэлефон; месца знаходжання ўстановы адукацыі і год выканання работы);

змест (змяшчае назву структурных частак работы з указаннем нумарацыі адпаведных старонак арабскімі лічбамі);

уводзіны (абгрунтоўваецца актуальнасць і навізна выбранай тэмы, мэта і змест пастаўленных задач, фармулюецца аб’ект і прадмет даследавання, указваецца метад (метады) даследавання для рашэння пастаўленых задач, аналізуецца існуючая літаратура па вызначанай тэме);

асноўная частка (павінна ўтрымліваць сабраную і апрацаваную даследчыкам інфармацыю: апісанне і аргументаваны аналіз асноўных разгледжаных фактаў са спасылкай на крыніцы, высновы);

заключэнне (утрымлівае асноўныя вынікі, да якіх аўтар прыйшоў у працэсе работы над даследаваннем, у адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі і задачамі. Пры гэтым адзначаецца самастойнасць, навізна, тэарэтычнае і фактычнае значэнне вынікаў, прапановы па магчымым практычным выкарыстанні вынікаў даследавання);

спіс выкарыстанай літаратуры і інфармацыйныя рэсурсы (уносяцца ўсе крыніцы, якія былі выкарыстаны аўтарам работы. Спіс афармляецца ў адпаведнасці з правіламі бібліяграфічнага апісання);

дадатак (размяшчаецца дапаможны матэрыял для больш поўнага раскрыцця зместу і вынікаў даследавання).

У тэксце работы абавязкова размяшчаюцца спасылкі на літаратуру і дадаткі.

Да тэкста навукова-даследчай работы неабходна прыкласці тэзісы (не болей 3 старонак), у якіх адлюстроўваецца актуальнасць тэмы, мэта і задачы, вынікі даследавання (магчыма з канкрэтнымі прыкладамі).

Рэкамендацыі да напісання і афармлення даследчых работ будуць размешчаны на сайце Рэспубліканскага цэнтра (http://rcek.by/) у раздзеле «Краязнаўства».

Да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца:

рэфератыўныя і апісальныя работы;

работы, якія змяшчаюць плагіят і парушаюць правы іншых аўтараў;

работы, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі падобных конкурсаў мінулых гадоў, з дапрацоўкай ў змесце менш чым на 25%;

работы, якія прадстаўлены на адпаведныя этапы пазней устаноўленага тэрміну або прадстаўленыя з парушэннем патрабаванняў дадзеных умоў.

4.4 Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных работ на першым туры:

актульнасць і навізна даследавання, тэарэтычная і практычная значнасць работы;

паўната раскрыцця тэмы;

навуковасць і аналітычны падыход;

лагічнасць выкладання, структураванне даследавання;

адпаведнасць умовам і патрабаванням конкурсу.

Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных работ на другім туры:

якасць выступлення (паўната, лагічнасць прадстаўлення работы, аргументаванасць, валоданне навуковым стылем выкладання, мультымедыйнае суправаджэнне);

камунікатыўныя якасці дакладчыка (эрудыцыя і культура аўтара, падрыхтаванасць да дыскусіі, утрыманне ўвагі аўдыторыі, вытрыманасць часу);

адказы на пытанні (паўната, аргументаванасць уласнага меркавання, перакананасць, уменне весці дыскусію і выкарыстоўваць адказы для паспяховага раскрыцця тэмы, ступень валодання інфармацыяй у абранай тэме).

4.5 Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў і прызёраў конкурсу

Конкурсныя матэрыялы пераможцаў і прызёраў абласных, Мінскага гарадскога этапаў конкурсу, не болей 6 праектаў у кожнай намінацыі, (у друкаваным выглядзе і абавязкова на электронным носьбіце) і пратаколы пасяджэння журы з указаннем колькаснага аналізу ўдзельнікаў рэгіянальных этапаў конкурсу дасылаюцца на рэспубліканскі

этап да 10 сакавіка 2023 года на адрас: 220114, г. Мінск, вул. Макаёнка, 8 (аддзел краязнаўства і патрыятычнага выхаванння Рэспубліканскага цэнтра). Тэлефон для даведак: (8017) 3200633, e-mail: krajaznaucy@mail.ru.

Конкурсныя матэрыялы, якія прадстаўлены на першы тур рэспубліканскага этапу, разглядаюцца рэспубліканскім журы конкурсу. Работы, якія па выніках ацэньвання журы набралі найбольшую колькасць балаў дапускаюцца да ўдзелу ў другім туры (не больш за 20 работ у кожнай намінацыі). Спіс удзельнікаў другога тура рэспубліканскага этапу конкурсу размяшчаецца на сайце Рэспубліканскага цэнтра (http://rcek.by/) прыкладна за два тыдні да пачатку другога тура рэспубліканскага этапу.

Пераможцы і прызёры заключнага этапу конкурсу вызначаюцца па выніках двух тураў і ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені (у кожнай намінацыі).

Пры падвядзенні вынікаў конкурсу пры роўнай колькасці балаў на падставе рашэння журы можа ўсталёўвацца адпаведная колькасць прызавых месцаў (першае, другое, трэцяе).

**5. Фінансаванне конкурсаў Акцыі ажыццяўляецца:**

на першым, другім, трэцім этапах – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, якія выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам;

на чацвёртым (заключным) этапе – ва ўстаноўленым парадку за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Камандзіровачныя выдаткі педагагічным работнікам і праезд удзельнікаў конкурсаў на заключны этап конкурсу ажыццяўляецца за кошт накіроўваючай арганізацыі.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ
# ДА НАПІСАННЯ І АФАРМЛЕННЯ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДЧЫХ КРАЯЗНАЎЧЫХ РАБОТ НАВУЧЭНЦАЎ

**Рэспубліканскі конкурс навуковых даследчых краязнаўчых работ** праводзіцца з мэтай развіцця навукова-даследчай дзейнасці як эфектыўнага фактару павышэння якасці адукацыі і ўсебаковага развіцця асобы навучэнца.

Навуковая даследчая дзейнасць навучэнца – гэта самастойная даследчая, творчая работа навучэнца, выкананая пад кіраўніцтвам педагога, змест і аб’ём якой выходзяць за рамкі вучэбнай праграмы. Педагог выступае ў якасці кіраўніка навучэнца пры выбары тэмы даследавання і яе фармуліроўцы, складанні плана работы і спіса літаратуры, вызначэнні заданняў для даследавання і абмеркаванні яго вынікаў, афармленні работы, праверцы тэкста.

**Напісанне навуковай даследчай работы ўключае наступныя этапы:**

- дыягнастычны (выбар тэмы, вызначэнне мэты і задач даследавання);
- прагнастычны (фармуляванне праблемы, яе актуальнасці і навізны);
- арганізацыйны (збор інфармацыі, складанне спіса літаратуры; запіс, перапрацоўка і сістэматызацыя матэрыялу);
- складанне плана работы; напісанне навукова-даследчай работы; фармуляванне высноў і заключэння;
- рэдагаванне тэксту; прагназаванне найбольш імавернасных пытанняў і адказаў на іх; падрыхтоўка да публічнага выступу).

Даследчая работа навучэнцаў павінна быць заснавана на мясцовым краязнаўчым матэрыяле.

Любая конкурсная работа, незалежна ад тэмы і зместу, павінна строга адпавядаць пэўнай логіцы: ад абгрунтавання актуальнасці тэмы, яе навізны, вызначэння праблемы, мэты і задач даследавання – да фармулявання высноваў. У добра напісанай працы ўсё павінна быць падпарадкавана адзінай ідэі, быць ўзаемазвязаным і ўзаемаабумоўленым.

Першым этапам пры падрыхтоўцы работы з’яўляецца **выбар тэмы**. Тэма прадвызначае ўвесь далейшы ход працы. Яна не павінна быць ні занадта шырокай, ні занадта вузкай. У той жа час, чым менш слоў у назве тэмы, тым яна шырэй. І наадварот, – чым больш слоў у назве, тым тэма ўжо, ахоплівае больш вузкую вобласць.

**Патрабаванні да тэмы навуковай даследчай работы:**

адпаведнасць устаноўленным умовамі тэмам намінацый;

актуальнасць і навізна;

навуковасць;

праблемнасць (даследча-пошукавы характар);

дакладнасць;

арыгінальнасць.

Наступны этап – **выпрацоўка структуры** даследчай працы. Тут неабходна прытрымлівацца патрабаванняў умовам конкурсу, у адпаведнасці з якімі ў структуру даследчай работы ўваходзяць: тытульны ліст; змест; уводзіны; асноўная частка; заключэнне; спіс літаратуры; дадатак (пры неабходнасці). Таксама, пры неабходнасці, пасля зместу размяшчаецца пералік умоўных пазначэнняў.

- Тытульны ліст (указваецца поўная назва ўстановы адукацыі (без скарачэнняў), раёна, вобласці, назва конкурсу/намінацыі/тэмы работы, прозвішча і імя аўтара работы, клас/аб’яднанне па інтарэсах, прозвішча, імя і імя па бацьку кіраўніка работы, пасада, кантактны тэлефон; месца знаходжання ўстановы адукацыі і год выканання работы).
- Змест (змяшчае назву структурных частак работы з указаннем нумарацыі адпаведных старонак арабскімі лічбамі).
- Уводзіны (абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць і навізна, мэта і задачы даследавання, фармулюецца аб’ект і прадмет даследавання, гіпотэза, указваюцца метады даследавання).

Пры вызначэнні актуальнасці неабходна паказаць, што ўжо зроблена ў гэтай галіне іншымі даследчыкамі і што мяркуецца выканаць аўтару дадзенай работы. Адлюстраванне навізны прадугледжвае паказ адрозненняў атрыманых вынікаў ад ужо вядомых. Мэта даследавання – асноўны напрамак даследчай дзейнасці. Задачы – гэта паслядоўныя крокі, якія забяспечваюць дасягненне пастаўленай мэты. Задачы даследавання канкрэтызуюць мэту, вызначаюць асноўны змест работы. Задачы могуць трансфармавацца ў назвы частак работы. Пры фармуляванні задач звычайна ўжываюцца дзеясловы: вызначыць, раскрыць, стварыць, выявіць, распрацаваць, усталяваць, абгрунтаваць і інш. Тыповымі памылкамі ў фармуляванні задач з’яўляюцца: задача фармулюецца больш шырока, чым мэта; задача фармулюецца амаль гэтак жа, як і мэта; задачы размяшчаюцца непаслядоўна; вялікая колькасць задач.

Вылучэнне гіпотэзы (навуковай здагадкі) – важная частка даследавання. Гіпотэза даследавання ўяўляе сабой сцвярджэнне, якое патрабуе праверкі. Наяўнасць гіпотэзы надае даследчай рабоце праблемны характар, ператварае яе з простай кампіляцыі ў даследаванне. Пры фармуліроўцы гіпотэзы можна выкарыстоўваць наступныя словы: можна выказаць здагадку ...; калі ..., то; мяркуецца, што ...; дапусцім ...; магчыма ...; пры ўмове што ... і г.д.

Таксама ва ўводзінах характарызуюцца выкарыстаныя метады даследавання для рашэння пастаўленых задач. Характарыстыка метадаў не абмяжоўваецца простым іх пералікам. Іх выкарыстанне павінна пацвярджацца ў матэрыялах асноўнай часткі работы.

Асноўная частка (дзеліцца на раздзелы і падраздзелы, якія павінны ўтрымліваць сабраны і апрацаваны даследчыкам матэрыял: апісанне і аргументаваны аналіз асноўных разгледжаных фактаў са спасылкай на крыніцы). Матэрыял таксама павінен адлюстроўваць тыя аспекты, якія засталіся паза полем зроку папярэдніх даследчыкаў (калі вяліся такія даследаванні) і на якія зроблены акцэнт у дадзенай рабоце.

Неабходна памятаць, што кожны раздзел (падраздзел) работы неабходна завяршаць кароткімі высновамі.

- Заключэнне (утрымлівае асноўныя высновы і вынікі, да якіх аўтар прыйшоў у працэсе работы над даследаваннем у адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі і задачамі. Пры гэтым адзначаецца самастойнасць, навізна, тэарэтычнае і фактычнае значэнне вынікаў, прапановы па магчымым практычным выкарыстанні вынікаў даследавання).

Важны момант: высновы павінны быць сфармуляваны ў змястоўным плане, г.зн. не проста называюцца вынікі даследавання, а і сціснута раскрываецца іх сутнасць.

- Спіс выкарыстанай літаратуры і інфармацыйныя рэсурсы.

Аўтар работы абавязаны спасылацца на крыніцы і матэрыялы, якія ён выкарыстоўваў у працэсе даследавання. Спіс выкарыстаных крыніц (кнігі, манаграфіі, газетныя або часопісныя артыкулы, адрасы сайтаў і інш.) складаецца ў алфавітным парадку прозвішчаў аўтараў альбо па меры з’яўлення іх у тэксце работы. Пры гэтым у тэксце зноскі абазначаюцца квадратнымі дужкамі з указаннем у іх парадкавага нумара крыніцы ў спісе і праз коску ўказваецца нумар старонкі (старонак), напрыклад: [4, с. 23], дзе 4 – нумар крыніцы ў спісе літаратуры, 23 – нумар старонкі. Спіс афармляецца ў адпаведнасці з правіламі бібліяграфічнага апісання.

- Дадатак (размяшчаецца дапаможны матэрыял для больш поўнага раскрыцця зместу і вынікаў даследавання).

У тэксце работы павінны быць спасылкі на дадаткі. Колькасць дадаткаў вызначаецца аўтарам работы. Сюды могуць быць уключаны: схемы, табліцы і ілюстрацыі дапаможнага характару; копіі архіўных дакументаў; фатаграфіі, графікі, карты, анкеты і г.д.; рэкамендацыі па практычным выкарыстанні атрыманых вынікаў і інш. Дадатак, як правіла, размяшчаецца пасля асноўнага зместу і працягвае нумарацыю старонак усёй працы. Пры неабходнасці дадатак можа афармляцца як самастойная частка і мець форму буклета, часткі кнігі, брашуры і г.д. У такім выпадку дадатак мае самастойную нумарацыю.

**Патрабаванні да афармлення конкурсных работ**

Работа афармляецца ў фармаце Word.

Фармат дакумента – А-4, арыентацыя кніжная.

Шрыфт – Times New Roman, памер – 14, абзацны водступ – 1,25 см, выраўноўванне – па шырыні; міжрадковы інтэрвал – 1,5, тэкст работы выраўноўваецца па шырыні.

Памер палёў: верхняга і ніжняга – 20 мм, левага – 30 мм, правага – 10 мм; шрыфт павінен быць выразным; дапускаецца выкарыстоўваць камп'ютарныя магчымасці акцэнтавання ўвагі на вызначэннях, тэрмінах, важных асаблівасцях тэксту.

Кожны структурны элемент работы павінен пачынацца з новай старонкі; загалоўкі структурных элементаў размяшчаюцца ў сярэдзіне радка без кропкі і друкуюцца вялікімі літарамі.

Змест пішацца з указаннем старонак.

Нумарацыя старонак скразная, пры гэтым на тытульным лісце і змесце нумары старонак не паказваюцца; нумары старонак паказваюцца ў правым ніжнім куце.

Ілюстрацыі (фотаздымкі, малюнкі, схемы, графікі, карты і інш.) і табліцы варта размяшчаць у рабоце непасрэдна на старонцы з тэкстам пасля абзаца, у якім яны згадваюцца ўпершыню; ілюстрацыі павінны мець найменне і тлумачальныя дадзеныя (тлумачальныя дадзеныя змяшчаюцца пад ілюстрацыяй, маюць нумар і назву).

*Пры падрыхтоўцы рэкамендацый выкарыстаны матэрыял, прадстаўлены ў нататку Валачко А.М. («Методические рекомендации по написанию и оформлению научно-исследовательской работы / НМУ «Национальный институт образования» Министерства образования Республики Беларусь»).*